# Алімпіядныя заданні

Марфалогія

IX клас

*Заданне 1. Запісаць словазлучэнні з назоўнікамі, раскрыць дужкі:*

1. Жыць у (згода, вёска, бацькі, Гродна).
2. Сумаваць па (маці, брат, сябры, Максім Танк).
3. Бегчы па (сцежка, парк, луг, станцыя).
4. Няма (вопыт, снег, нехта, штосьці, хлеб).
5. Бачу (дзеці, возера Нарач, гусь, аднакласнікі).
6. Адпачываць з (дзядуля Янка, бабуля Зося, сябра Жэня, сяброўка Ліля).
7. Ганарыцца (гімназія, ліцэй, вучань Пеця, возера Свіцязь, настаўнік Даніла Платонавіч).

*Максім. к-ць—5 балаў*

*Заданне 2. Вызначыць, якой часцінай мовы з'яўляюцца прапанаваныя словы.*

Дзесятак, тройчы, сотня, шасцідзесятнікі, патроіць, чвэрць, пятак, палавіна, трайны, удвух, здвоены, тройня, двухсоты, шасцёрка, сямёра, абедзве, мноства, многае, дваякі, саракавіны, падвоіўшы, стагоддзе, соты, стогадовы, мільён.

*Максім. к-ць—5 балаў*

*Заданне 3. Вызначце лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў.*

*Максім. к-ць — 5 балаў*

Чаротавы, матчын, купалаўскі, карычневы, мёртвы, сынаў, вавёркавы, вавёрчын, васковы, цараў, жаночы, жончын, драўляны, буслаў, заўтрашні, рухомы, дзедаў, фальшывы, шурпаты, залаты

*Заданне 4. Складзіце з назоўнікамі словазлучэнні, дапасоўваючы прыметнікі, дзеепрыметнікі ці займеннікі.*

*1 словазлучэнне—0,5 балаў*

Шампунь, вусень, лодар, запявала, шашаль, цень, страшыдла, бяліла, дроб, шаль.

*Заданне 5. Упішыце ў сказы зваротны займеннік **сябе** у адпаведнай форме.*

*Максім.к-ць – 5 балаў*

I.Начлег з ... не носяць, а ў людзей просяць. 2. Не хвалі ... сам, хай другія пахваляць. 3. Добра быць у дарозе, якую ты сам ... выбіраеш. 4. Пчолка ўсю ... аддае вялікаму зямному жыццю. 5. Як у ... нічога не мае, то на ... найбольш чапляе. 6. Я цяпер болей гляджу на яго, чым ... падногі. 7. Ніколі яму не было так ... шкада, як сёння. 8. Нельга здраджваць самому ..., потым і выйсця не знойдзеш. 9. Калі можаш, дапамажы ... сам. 10. Кажуць, што ад ... ніколі не ўцячэш.

*Заданне 6. Замяніце выразы словазлучэннямі з прыслоўямі. Запішыце прыслоўі.*
*0,5 балаў за правільна запісанае словазлучэнне*

Свістаць, як салавей; смяяцца, як дзіця; змагацца, як герой; клапаціцца, як бацька; выць, як воўк; хай будзе, як вы хочаце; гаварыць на французскай мове; апрануты, як у горадзе; зрабіць, як ты параіў; прыбрацца, як у свята.

*Заданне 7. Запішыце словазлучэнні па-беларуску.*
*1 словазлучэнне—0,5 балаў*

Три деревни, три больших дерева, два соловья, четыре дома, полтора ведра, полторы тысячи, оба брата, обе подруги, два стадиона, две зимних шапки.

*Заданне 8. Замяніць апісанні дзеянняў адным дзеясловам. Запісаць па ўзору: аб'явіць несапраўдным — адмяніць*
*1 дзеяслоў — 0,5балаў*

Рабіць аперацыю хвораму; падтрымліваць раўнавагу з дапамогай рухаў цела; прызнаваць што-небудзь непрыгодным, недабраякасным; часта пераязджаць з маёмасцю з аднаго месца на другое; рабіць хвалістыя паралельныя складкі; вучыць жывёл выконваць якія-небудзь дзеянні; падкідваць і спрытна лавіць на ляту адначасова некалькі прадметаў; часова выконваць чые-небудзь абавязкі; ствараць што-небудзь без папярэдняй падрыхтоўкі, на хаду, у час выканання; накіраваць куды-небудзь са службовым даручэннем.

*Заданне 9. Утварыць парадкавыя лічэбнікі ад лічбаў 4, 8, 60, 80, 200, 700, 35, 2006, 20 000, 375 000.*
*1 лічэбнік—0,5 балаў*

*Заданне 10. Спішыце сказы. Адкажыце, у якіх выпадках выдзеленыя словы — прыслоўі, у якіх — прыназоўнікі.*
*Максім. к-ць — 5 балаў*

1.Дзень пачынаўся мокры. *Скрозь* стаяла вада і са стрэх капала. 2. *Скрозь* галіны лесу свеціцца шэрае, агорнутае воблакамі неба. 3. *Вакол* было ціха і глуха. 4. Вада падмывала пясчаны бераг, вірылася *вакол* вярбы. 5. І лінуў дождж, буйны, густы, і ўсё *навокал* зашумела. 6. *Навокал* поплаву чарнеўся лес. 7. Яна [Ганна] прачнулася ад таго, што *побач* успыхнуў агеньчык. 8. *Побач* чыгункі ўжо цягнулася доўгая жоўтая паласа адтаўшай зямлі. 9.*Насустрач* мне праходзяць людзі, і мне ім хочацца сказаць: няхай дастаткаў вам прыбудзе, хай родзяць нівы, сенажаць. 10. За мастом дарога заварочвала і вяла *ўздоўж* Дняпра.

Адказы на лінгвістычныя заданні

Заданне 1.

1. Жыць у згодзе, вёсцы, бацькоў, Гродне.
2. Сумаваць па маці, брату, сябрах, Максіму Танку.
3. Бегчы па сцежцы, парку, лузе, станцыі.
4. Няма вопыту, снегу, некага, чагосьці, хлеба.
5. Бачу дзяцей, возера Нарач, гусь, аднакласнікаў.
6. Адпачываць з дзядулем Янкам, бабуляй Зосяй, сябрам Жэнем, сяброўкай Ліляй.
7. Ганарыцца гімназіяй, ліцэем, вучнем Пецем, возерам Свіцяззю, настаўнікам Данілам Платонавічам.

Заданне 2.

• Назоўнікі: дзесятак, сотня, шасцідзесятнікі, чвэрць, пятак, палавіна, тройня, шасцёрка, мноства, многае, саракавіны, стагоддзе, мільён (калі ўжываецца без назоўніка).

Прыметнікі: трайны, дваякі, стогадовы.

Лічэбнікі: двухсоты, сямёра, абедзве, соты, мільён (калі ўжываецца з назоўнікам).

Прыслоўі: тройчы, удвух.

Дзеяслоў: патроіць.

Формы дзеяслова: а) дзеепрыметнік - здвоены, б) дзеепрыслоўе - падвоіўшы.

Заданне 3.

Якасныя: карычневы, мёртвы, рухомы, фальшывы, шурпаты.

Адносныя: чаротавы, купалаўскі, вавёркавы, васковы, жаночы, драўляны, заўтрашні, залаты.

Прыналежныя: матчын, сынаў, вавёрчын, цараў, жончын, буслаў, дзедаў.

Заданне 4.

Дарагі шампунь, зялёны вусень, вядомы лодар, гэты (гэтая) запявала, шкодны шашаль, доўгі цень, тое страшыдла, свежае бяліла, дзесятковы дроб, цёплы шаль.

Заданне 5.

І.Начлег *з сабой* не носяць, а ў людзей просяць. 2. Не хвалі *сябе* сам, хай другія пахваляць. 3. Добра быць у дарозе, якую ты сам *сабе* выбіраеш. 4. Пчолка ўсю *сябе* аддае вялікаму зямному жыццю. 5. Як у *сабе* нічога не мае, то на *сябе* найбольш чапляе. 6. Я цяпер болей гляджу на яго, чым *сабе* пад ногі. 7. Ніколі яму не было так *сябе* шкада, як сёння. 8. Нельга здраджваць самому *сабе,* потым і выйсця не знойдзеш. 9. Калі можаш, дапамажы *сабе* сам. 10. Кажуць, што ад *сябе* ніколі не ўцячэш.

Заданне 6.

Свістаць па-салаўінаму, смяяцца па-дзіцячы, змагацца па-геройску, клапаціцца па-бацькоўску, выць па-воўчы, хай будзе па-вашаму, гаварыць па-французску, апрануцца па-гарадскому, зрабіць па-твойму, прыбрацца па-святочнаму.

Заданне 7.

Тры вёскі, тры вялікія дрэвы, два салаўі, чатыры дамы, паўтара вядра, паўтары тысячы, абодва браты, абедзве сяброўкі, два стадыёны, дзве зімовыя шапкі.

Заданне 8.

Рабіць аперацыю хвораму — аперыраваць; падтрымліваць раўнавагу з дапамогай рухаў цела — балансаваць; прызнаваць што-небудзь непрыгодным, недабраякасным — бракаваць; часта пераязджаць з маёмасцю з аднаго месца на другое — вандраваць; рабіць хвалістыя паралельныя складкі — гафрыраваць; вучыць жывёл выконваць якія-небудзь дзеянні — дрэсіраваць; падкідваць і спрытна лавіць на ляту адначасова некалькі прадметаў — жангліраваць; часова выконваць чые-небудзь абавязкі — замяшчаць; ствараць што-небудзь без папярэдняй падрыхтоўкі, на хаду, у час выканання — імправізаваць ; накіраваць куды-небудзь са службовым даручэннем — камандзіраваць.

Заданне 9.

Чацвёрты, восьмы, шасцідзесяты, васьмідзесяты, двухсоты, сямісоты, трыццаць пяты, дзве тысячы шосты, дваццацітысячны, трохсотсямідзесяціпяцітысячны.

Заданне 10.

Сказы з прыслоўямі: 1, 3, 5, 7.

Сказы з вытворнымі прыназоўнікамі: 2, 4, 6, 8, 9, 10